Віцебск.info

№1 6/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Арыштаваны наклад “Народнай Волі", прысьвечаны падзеям 2 сакавіка!** Прычынай затрыманьня “Народнай Волі” стаў зьмест апошняга нумару. Артыкулы “2 сакавіка, Менск, “Усебеларускі народны хапун”, “Чорны чацьвер”, “Стралялі”, а таксама шматлікія фатаздымкі паведамлялі падрабязнасьці падзеяў зьбіцьця Аляксандра Казуліна. Газэта надрукавала і поўны выступ Аляксандра Казуліна, які быў скарочаны падчас трансьляцыі на першым канале БТ. Згаданы нумар “Народнай Волі” выйшаў накладам 250 тысяч асобнікаў. Яго затрымалі ў мінулую суботу на тэрыторыі Дубровенскага раёну яго пры перавозцы ў Менск з друкарні Смаленску.

# Цытаты

**Старшыня віцебскай ўчастковай камісіі № 52 спадарыня Шубіна аддала загад выдаліць маё прозьвішча з выбарчых сьпісаў.** Менавіта на гэтым участку я галасаваў на парлямэнцкіх выбарах у 2004-м годзе, і тут жа выконваў функцыі назіральніка. Тым самым часам распаўсюджваў у Першамайскім раёне Віцебску ўлёткі з заклікам не хадзіць на датэрміновае галасаваньне, і атрымаў за гэта пакараньне — 10 сутак арышту. Менавіта мая грамадзкая актыўнасьць у часе мінулых выбараў сталася падставай для таго, каб выкрасьліць мяне са сьпісу віцебскіх выбарцаў.
*Валеры Шчукін*

# Людзі

**Дэпутат гарсавету Вольга Карач** павіншавала віцебскіх жанчын з Міжнародным днём жаночай салідарнасьці імя Клары Цэткін. 30 000 віншаваньняў віцяблянкі знайшлі ў сваіх паштовых скрынях.

# Абвесткі

**Тыя, хто цікавіцца працэдурай Народнага галасавання,** могуць зьвяртацца да Уладзіміра Плешчанкі (каля “Сіняга дома”, панядзелак і чацьвер, 11.00-13.00).